ПРАВААБАРОНЦЫ
ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ

**Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

# Аналітычная тыднёвая справаздача па выніках назірання: 1–7 чэрвеня 2020 года.

*Назіранне за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца РПГА «Беларускі Хельсінкскі камітэт» і ПЦ «Вясна» ў рамках кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары».*

## Высновы

- За азначаны перыяд справаздачы працягваўся актыўны збор подпісаў ініцыятыўнымі групамі па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Сярод патэнцыйных кандыдатаў найбольшую ўвагу выбаршчыкаў і СМІ, як і раней, прыцягваюць патэнцыйныя кандыдаты Віктар Бабарыка, Валер Цапкала і Святлана Ціханоўская;
- Асаблівую негатыўную рэакцыю ўладаў, у тым ліку і кіраўніка дзяржавы, выклікалі пікеты па зборы подпісаў, якія праводзяцца ініцыятыўнай групай па вылучэнні С. Ціханоўскай, а дакладней камандай блогера і кіраўніка дадзенай ініцыятыўнай групы Сяргеем Ціханоўскім;
- У розных гарадах краіны на працягу тыдня адбываліся масавыя затрыманні і арышты актывістаў апазіцыйных груп, у тым ліку сябраў ініцыятыўнай групы С. Ціханоўскай. Іх абвінавачваюць ва ўдзеле ў несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах, а менавіта ў пікетах па зборы подпісаў, якія адбываліся ў незабароненых рашэннямі мясцовых выканаўчых органаў улады месцах. Эксперты кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” адзначаюць, што пікеты па зборы подпісаў праводзіліся ў адпаведнасці з арт. 61 ВК і з выкананнем патрабаванняў аб забароне раздачы друкаваных і іншых агітацыйных матэрыялаў пры іх правядзенні;
- Ад моманту затрымання на пікеце па зборы подпісаў у Гродна 29 мая блогер С. Ціханоўскі і яшчэ сем чалавек (чацвёра з іх сябры ініцыятыўнай групы С. Ціханоўскай) знаходзяцца ў СІЗА г. Мінска у якасці падазраваных па крымінальнай справе аб гвалце ў дачыненні да

супрацоўніка міліцыі, пры гэтым у межах распачатай справы адбываюцца актыўныя следчыя дзеянні: допыты сведак,ператрусы ў прыватных і службовых памяшканнях як самога С. Ціханоўскага, так і ягоных прыхільнікаў. Дадзеная крымінальная справа актыўна асвятляецца ў дзяржаўных СМІ;

- 4 чэрвеня кіраўнік дзяржавы выступіў з чарговымі рэзкімі негатыўнымі выказваннямі ў адрас сваіх апанентаў. Дадзены выступ трансляваўся па дзяржаўных тэлеканалах;
- Збор подпісаў за вылучэнне кандыдатам у прэзідэнты дзеючага кіраўніка дзяржавы суправаджаецца шматлікімі паведамленнямі аб актыўным выкарыстанні адміністрацыйнага рэсурсу: збор подпісаў з непасрэдным удзелам адміністрацый арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў (у тым ліку аховы здароўя і адукацыі) на працоўных месцах, у тым ліку ў працоўны час;
- ЦВК адмовіла ў задавальненні скаргі ініцыятыўнай групы па вылучэнні кандадатам В. Бабарыкі на парушэнні выбарчага заканадаўства пры зборы подпісаў ініцыятыўнай групай па вылучэнні А. Лукашэнкі. Пры гэтым эксперты кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” адзначаюць фармальны характар разгляду і селектыўныя падыходы ЦВК да трактоўкі некаторых нормаў выбарчага заканадаўства на карысць аднаго з патэнцыйных кандыдатаў: нормаў ВК, якія забараняюць удзел адміністрацый арганізацый у зборы подпісаў (ч.10. арт 61 ВК);
- Эксперты кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” адзначаюць каардынальна іншыя падыходы ЦВК да пытання магчымасці правядзення агітацыі да рэгістрацыі кандыдатаў падчас селетняй выбарчай кампаніі ў параўнанні з папярэднімі прэзідэнцкімі і парламенцкімі выбарамі. ЦВК варта выпрацаваць адзіныя правілы для ўсіх кандыдатаў, незалежна ад іх палітычных поглядаў і ўладных паўнамоцтваў з мэтай недапушчэння дыскрымінацыйных падыходаў у ацэнцы вядзення выбарчай кампаніі рознымі суб'ектамі.
- У цэлым прадстаўнікі кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” адзначаюць працяг тэндэнцыі павелічэння рэпрэсій у выбарчы перыяд, у тым ліку супраць непасрэдных удзельнікаў выбарчай кампаніі, і нагнятанне ўладамі напружанасці і атмасферы страху ў грамадстве.

**Агульная сітуацыя**

У перыяд з 1 па 7 чэрвеня працягваўся збор подпісаў выбаршыкаў ініцыятыўнымі групамі ў падтрымку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Найбольшую актыўнасць праяўлялі ініцыятыўныя групы па вылучэнні ў якасці кандадатаў В. Бабарыкі, В. Цапкалы і С. Ціханоўскай. Іх дзейнасць акатыўна асвятлялася ў шэрагу незалежных СМІ.

Збор подпісаў па вылучэнні ў якасці кандыдата дзеючага кіраўніка дзяржавы А. Лукашэнка суправаджаецца шматлікімі паведамленнямі аб выкарыстанні адміністратыўнага рэсурсу і збору подпісаў пры непасрэдным удзеле адміністрацый арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў (у тым ліку аховы здароўя і адукацыі) на працоўных месцах, у тым ліку ў працоўны час.

Пасля затрымання на пікеце па зборы подпісаў у г. Гродна блогера і кіраўніка ініцыятыўнай групы Святланы Ціханоўскай яе мужа, блогера Сяргея Ціханоўскага па ўсёй краіне працягваліся затрыманні і ператрусы прыхільнікаў і сябраў дадзенай ініцыятыўнай групы[1].

Таксама фіксаваліся выпадкі прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці, у тым ліку ў выглядзе адміністратыўных арыштаў, па арт. 23.34 КаАП (арганізацыя ці ўдзел у масавых мерапрыемствах) удзельнікаў пікетаў па зборы подпісаў у падтрымку вылучэння ў якасці кандыдата ў Прэзідэнты Святланы Ціханоўскай, у тым ліку і сябраў яе ініцыятыўнай групы[2]. 5 чэрвеня ў Гомелі праваахоўнікамі быў затрыманы, а пазней вызвалены, адзін з прэтэндэнтаў у кандыдаты Уладзімір Няпомняшчых. У дачыненні да яго быў распачаты адміністрацыйны працэс па арт. 23.34 КаАП[3].

Асабліва актыўна затрыманні сталі ажыцяўляцца праваахоўнымі органамі пасля шэрагу выступаў высокапастаўленых службовых асобаў, уключна з дзеючым кіраўніком дзяржавы А. Лукашэнкам, у якіх яны адзначалі супрацьпраўны і недапушчальны характар пікетаў па зборы подпісаў, якія праводзяцца ініцыятыўнай групай па вылучэнні С. Ціханоўскай.

Затрыманыя ў межах распачатай крымінальнай справы Сяргей Ціханоўскі і яшчэ 8 чалавек, чацвёра з якіх з’яўляюцца сябрамі ініцыятыўнай групы С. Ціханоўскай. Яны знаходзяцца ў ІЧУ і СІЗА г. Мінска. Па інфармацыі, якой валодаюць прадстаўнікі кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” абвінавачванне ўсім затрыманым не прад’яўлена, яны знаходзяцца ў статусе падазраваных.

У межах распачатай справы актыўна праводзяцца следчыя дзеянні – допыты

---

[1] http://spring96.org/be/news/97371
[2] https://news.tut.by/elections/687425.html
[3] http://rec.gov.by/ru/vybory-2020

сведак,ператрусы ў прыватных памяшканнях і офісах прыхільнікаў С. Ціханоўскага, у тым ліку і ў прыватных памяшканнях самога блогера. Так, 4 чэрвеня стала вядома, што падчасператрусу на лецішчы С. Ціханоўскага каля г. Гомеля паведамлялася, што следчымі былі знойдзеныя грашовы сродкі ў памеры 900 000 долараў ЗША.

4 чэрвеня падчас свайго выступу, якія трансляваўся па дзяржаўным тэлебачанні, кіраўнік дзяржавы А. Лукашэнка ў чарговы раз выступіў з рэзкай негатыўнай крытыкай сваіх апанентаў, адзначыўшы пры гэтым, што "краіну яны не атрымаюць".

**Пасяджэнні ТВК і ЦВК**

Нягледзячы на абвешчаную пандэмію COVID-19, усе пасяджэнні тэрытарыяльных камісій праходзяць у звычайным рэжыме, без трансляцый сваіх пасяджэнняў пры дапамозе сеткі Інтэрнэт. Назіральнікі дапускаюцца на пасяджэнні.

Назіральнікі адзначаюць, што ў некаторых акруговых камісіях вялікая частка працы вядзецца па-за пасяджэннямі у адсутнасць назіральнікаў: у Ленінскай раённай ў г. Брэсце выбарчай камісіі, Ленінскай раённай у г. Магілёве выбарчай камісіі, Крычаўскай раённай выбарчай камісіі, Кастрычніцкай раённай ў г. Гродна выбарчай камісіі.

Як правіла, сябры камісій выконваюць патрабаванні Міністэрства аховы здароўя па сацыяльным дыстанцыяванні.

4 чэрвеня адбылося пасяджэнне ЦВК, падчас якога былі разгледжаны скаргі, якія паступілі ў камісію, і прыняты пастановы № 85 "Аб растлумачэнні прымянення палажэнняў Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб парадку дэкларавання даходаў і маёмасці пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2020 годзе", № 86 "Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2020 годзе" і № 87 "Аб Назіральнай радзе па кантролі за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарчай агітацыі ў сродках масавай інфармацыі".

Парадак дэкларавання даходаў і маёмасці пры правядзенні выбараў Прэзідэнта ў 2020 годзе застаўся ў цэлым ранейшым і заключаецца ў падачы дэкларацый аб даходах і маёмасці усталяванай формы асобай, якая вылучана кандыдатам у Прэзідэнты, і яго (яе) жонкай (мужам) і паўналетнімі блізкімі сваякамі, якія сумесна з ім (ёй) пражываюць і вядуць агульную гаспадарку. Па-ранейшаму ЦВК

правярае гэтыя звесткі з прыцягненнем магчымасцяў кантралюючых і рэгіструючых дзяржаўных органаў.

У параўнанні з парадкам дэкларавання, якія дзейнічаў на прэзідэнцкіх выбарах 2015 года, змянілася паняцце істотнага характару звестак, якія не адпавядаюць рэчаіснасці. Па-ранейшаму, істотны характар мае дэкларацыя агульнай сумы гадавога даходу ў меншым памеры, калі неадпаведнасць складае больш за 20 працэнтаў агульнай сумы гадавога даходу; адсутнасць звестак пра нерухомую маёмасць, долі ў праве ўласнасці на такую маёмасць, якія належаць на праве ўласнасці; адсутнасць звестак пра транспартныя сродкі, якія належаць на праве ўласнасці, за выключэннем транспартных сродкаў, якія знаходзяцца ва ўгоне. Істотны характар будзе мець не толькі адсутнасць звестак пра акцыі і адсутнасць звестак аб долі ў статутным фондзе юрыдычнай асобы, але і ўказанне акцый у меншай колькасці, адсутнасць звестак аб долі (не пацверджанай акцыямі) ў паі ў маёмасці юрыдычнай асобы, аб юрыдычнай асобе, адзіным уласнікам маёмасці якой з'яўляецца асоба, якая запоўніла дэкларацыю.

Раней дзеючае правіла аб тым, што з ліку юрыдычных асоб, звесткі пра долю ў якіх неабходна было ўказаць у дэкларацыі, выключаліся тыя, што знаходзяцца ў працэсе ліквідацыі, дапоўнена: ня будзе парушэннем неўказанне звестак пра акцыі, долі (не пацверджанай акцыямі) у статутным фондзе юрыдычнай асобы, перададзеных ва ўстаноўленым парадку ў давернае кіраванне.

Згодна з новымі правіламі пералік звестак, якія не маюць істотнага значэння, дапоўніўся указаннем даходаў, колькасці акцый у большым памеры.

Устаноўленыя правілы супадаюць з тымі, якія былі ўсталяваныя ЦВК на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў 2019 годзе.

Парадак выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта прадугледзеў права кандыдата бясплатна апублікаваць сваю перадвыбарчую праграму ў друкаваных сродках масавай інфармацыі; у пастанове паказаны пералік з 10 цэнтральных і абласных газет. У параўнанні з папярэднімі выбарамі Прэзідэнта ў 2015 годзе, пералік скараціўся на 1 выданне ("Народная газета").

Кандыдат у Прэзідэнты мае права на два бясплатных выступы ў эфіры тэлеканала "Беларусь-1" і на два бясплатных выступы ў эфіры радыёпраграмы "Першы нацыянальны канал Беларускага радыё" Белтэлерадыёкампаніі працягласцю не больш за 30 хвілін кожнае. Акрамя таго, магчыма правядзенне тэледэбатаў працягласцю да 60 хвілін (да 90 - пры колькасці ўдзельнікаў больш за 5). Перадвыбарчыя выступы кандыдатаў у Прэзідэнты і тэледэбаты ідуць у прамым эфіры, калі кандыдат у прэзідэнты не пажадае, каб яго перадвыбарчы

выступ трансляваўся ў запісе. У выступах кандыдатаў не дапускаецца выкарыстанне аўдыё – і відэаматэрыялаў.

Назіральная рада па кантролі за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарчай агітацыі ў сродках масавай інфармацыі (далей – Назіральная рада) створана на перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў Прэзідэнта; яна фарміруецца з ліку спецыялістаў у галіне рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасці, прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі і грамадскіх аб’яднанняў журналістаў.

Рашэнні Назіральнай рады прымаюцца адкрытым галасаваннем большасцю галасоў ад агульнага складу. Парадак галасавання ў параўнанні з тым, які дзейнічаў на выбарах Прэзідэнта ў 2015 годзе дапоўнены правілам аб тым, што пры роўнай колькасці галасоў, пададзеных «за» і «супраць», прынятым лічыцца рашэнне, за якое прагаласаваў старшынствуючы.

Сфера кантролю ў галіне ўстанаўлення сродкамі масавай інфармацыі адзіных для ўсіх кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь памеру і ўмоў аплаты распаўсюдзілася і на месцы для публікацыі на інфармацыйных рэсурсах (іх складовых частках), размешчаных у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт.

Палажэнне аб Назіральнай радзе ў параўнанні з тым, што дзейнічала на выбарах Прэзідэнта ў 2015 годзе, дапоўнена правілам аб тым, што сябры Назіральнай рады ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы ў рамках дзейнасці Назіральнай рады як калегіяльнага органа і не маюць права дзейнічаць ад яго імя, калі не ўпаўнаважаны на гэта Назіральнай радай або яго старшынёй. Таксама Палажэнне дапоўнена пунктам аб магчымасці датэрміновага спынення паўнамоцтваў сябра Назіральнай рады: па яго пісьмовай заяве; у выпадку вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь; пры здзяйсненні ім дзеянняў, якія перашкаджаюць працы Назіральнай рады альбо перавышаюць паўнамоцтвы сябра Назіральнай рады, на падставе рашэння Цэнтральнай камісіі, прынятага па прапанове старшыні Назіральнай рады.

**Збор подпісаў**

Збор подпісаў праводзяць ўсе 14 груп, якія зарэгістраваныя ЦВК.

Найбольш актыўныя ў зборы подпісаў шляхам пікетавання сталі ініцыятыўныя групы па вылучэнні ў якасці кандыдатаў В. Бабарыкі, В. Цапкалы і С. Ціханоўскай. Самі прэтэндэнты ў кандыдаты В. Бабарыка і В. Цапкала актыўна сустракаюцца з выбаршчыкамі ў розных гарадах краіны.

Пікеты незалежных кандыдатаў часта збіраюць вялікую колькасць жадаючых паставіць свой подпіс.

Асабліва негатыўную рэакцыю ўладаў, у тым ліку і кіраўніка дзяржавы, выклікалі пікеты па збору подпісаў ініцыятыўнай групы С. Ціханоўскай.

Так, падчас нарады са старшынём КДБ В. Вакульчыкам кіраўнік дзяржавы А. Лукашэнка адзначыў, што ў Мінску і ва ўсіх гарадах ёсць кропкі дзе можна дыскутаваць і папярэдзіў, што "майданаў" у Беларусі не будзе[4].

Аб недапушчальнасці фармату збору подпісаў па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты "ў мэтах маніпулявання свядомасцю людзей, нагнятання сацыяльнай напружанасці і спекуляцый на складанай эканамічнай і санітарна-эпідэміалагічнай сітуацыі" у адмысловай заяве адзначылі дэпутаты пастаянна дзеючай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту[5].

Старшыня ЦВК падчас паседжання камісіі 4 чэрвеня назвала метады С. Ціханоўскага (правядзенне пікетаў па зборы подпісаў) "метадамі браткоў з 90-х" і паведаміла, што мае намер звярнуцца ў СК з заявай, у якой просіць разгледзець дзеянні Ціханоўскага і ягонай ініцыятыўнай групы на прадмет наяўнасці складу злачынства па арт. 191 КК (перашкоды ажыццяўленню выбарчых правоў, права на ўдзел у рэферэндуме, альбо рэалізацыі права заканадаўчай ініцыятывы грамадзян, альбо працы Цэнтральнай камісіі, выбарчых камісій, камісій па рэферэндуму, камісій па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутута)[6].

Старшыня Мінгарвыканкама Анатоль Сівак 30 мая заявіў[7] аб тым, што такі фармат збору подпісаў непрымальны, а пасля заявіў[1] аб магчымасці прымянення рэпрэсій у дачыненні да ўдзельнікаў шматлюдных пікетаў.

Пасля гэтых заяў па ўсёй краіне прайшлі затрыманні ўдзельнікаў пікетаў па вылучэнню С. Ціханоўскай, у тым ліку і сябраў яе ініцыятыўнай групы. Так, 7 мая ў Мінску і Гомелі адбыліся затрыманні грамадзян, якія прымалі ўдзел у пікетах па зборы подпісаў, у тым ліку і сябраў ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў С. Ціханоўскай і В. Кавальковай.

Пікетаў у падтрымку вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты А. Лукашэнка практычна не заўважна. Па звестках назіральнікаў, на карысць дзейнага прэзідэнта подпісы збіраюць у асноўным у працоўных калектывах, часта з выкарыстаннем адміністрацыйных магчымасцяў сябраў ініцыятыўнай групы і кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый. У ходзе пасяджэння ЦВК 4 чэрвеня кіраўнік ініцыятыўнай групы – старшыня праўладнай Федэрацыі прафсаюзаў

[4] https://news.tut.by/elections/687175.html
[5] https://elections2020.spring96.org/be/news/97354
[6] https://elections2020.spring96.org/be/news/97376
[7] https://minsk.gov.by/ru/news/new/2020/06/02/1076/

Беларусі М. Арда заявіў аб тым, што палова подпісаў за вылучэнне кандыдата сабраная па месцы жыхарства грамадзян.

5 чэрвеня ў Мінску каля гандлёвага цэнтру “Дана мол” па праспекце Незалежнасці ФПБ, “Белая Русь” і БРСМ правялі першы публічны пікет па зборы подпісаў за вылучэнне кандыдатам А. Лукашэнкі. Пікет выклікаў вялікую ўвагу з боку як дзяржаўных, так і незалежных СМІ. У пікеце прыняў удзел кіраўнік ініцыятыўнай групы па вылучэнні А. Лукашэнкі, старшыня ФПБ М. Орда, які заявіў, што за вылучэнне А. Лукашэнкі ўжо сабраны мільён подпісаў выбаршчыкаў[8].

Доўгатэрміновыя назіральнікі кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” працягваюць паведамляць пра актыўнае выкарыстанне адміністратыўнага рэсурсу пры зборы подпісаў за вылучэнне ў якасці кандыдата ў Прэзідэнты дзеючага кіраўніка дзяржавы. У асноўным гэта выпадкі арганізаванага збору подпісаў адміністрацыямі арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў (у тым ліку аховы здароўя і адукацыі) у падначаленых ім працоўных калектывах на тэрыторыі арганізацый, у тым ліку і ў працоўны час[9]. Эксперты кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” неаднаразова адзначалі неабходнасць ўключэння тэрыторый прадпрыемстваў і арганізацый у пералік месцаў забароненых для збору подпісаў, якія вызначаюцца рашэннямі мясцовых выканаўчых органаў улады[10].

Назіральніца кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” са Светлагорску Алена Маслюкова паскардзілася ў пракуратуру на выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу для збора подпісаў у падтрымку дзеючага прэзідэнта.

Цягам мінулага тыдня назіральніца атрымала некалькі паведамленняў наконт таго, што на прадпрыемствах горада, а менавіта на РУП ВА “Хімвалакно”, Вышкамантажным упраўленні, Цэлюлозна-картонным камбінаце адбываецца ціск на патэнцыйных выбаршчыкаў, работнікаў дадзеных прадпрыемстваў. Іх прымушаюць ставіць подпіс за прэтэндэнта ў кандыдаты ў прэзідэнты Аляксандра Лукашэнку[11].

Таксама ёй паведамілі, што старшыня Светлагорскай раённай выбарчай камісіі Канстанцін Пятроўскі ездзіў па прадпрыемствах горада, і пасля яго візітаў пачынаўся прымус падпісвацца за Лукашэнку.

Адразу некалькі студэнтаў факультэта матэматыкі і прыродазнаўства МДУ ім.

---

[8] https://mspring.online/signature-for-lukashenko/
[9] https://elections2020.spring96.org/be/news/97266
[10] http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2020/otvet1.pdf
[11] https://elections2020.spring96.org/be/news/97266

А. Куляшова г. Магілева паведамілі аб адміністрацыйным рэсурсе, які выкарыстоўвае кіраўніцтва ВНУ дзеля рэгістрацыі ў якасці кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Лукашэнкі.

Згодна з іх інфармацыяй, дэкан факультэта Наталля Саковіч папрасіла іх прынесці пашпарты на экзамен, які павінен быў адбыцца ў пятніцу 29 траўня. Акрамя таго, лаяльныя кіраўніцтву студэнты высвятлялі, хто вучыцца на бюджэтнай аснове, а хто – на платнай.

Экзамен студэнты здалі «аўтаматам». Але перад тым, як выйсці з аўдыторыі, іх прапускалі праз сумежны кабінет, у якім знаходзіўся прарэктар ВНУ Алег Дзячэнка, які таксама з'яўляецца дзеючым сябрам Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь.

Ён прапаноўваў студэнтам паставіць подпіс за вылучэнне Аляксандра Лукашэнкі ў якасці кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Доўгатэрміновы назіральнік кампаніі паведамляе, што ў рэдакцыю інтэрнэт-выдання "Першы Рэгіён" звярнуўся жыхар Драгічына, які паведаміў, што начальнік аддзела адукацыі Драгічынскага райвыканкама Дзмітрый Ігнатчык збіраў подпісы за вылучэнне кандыдатам у прэзідэнты Аляксандра Лукашэнкі ў сярэдняй школе №2.

Карэспандэнт "Першага рэгіёна" ўдакладніў у дырэктара СШ №2 Драгічына Сяргея Сенькаўца, ці праўда, што начальнік аддзела адукацыі збіраў подпісы ў настаўнікаў у працоўны час.

Сяргей Андрэевіч растлумачыў, што подпісы Дзмітрый Ігнатчык збіраў не ў яго кабінеце, а ў настаўніцкай, і не ў працоўны час, а ў абедзенны перапынак. Начальнік аддзела адукацыі Дзмітрый Ігнатчык на пытанне журналістаў адказаў коратка: "Я не размаўляю з карэспандэнтамі".

## Скаргі і звароты

У ЦВК на 4 чэрвеня 2020 года паступіла 465 зваротаў грамадзян; з іх 236 старшыня ЦВК Л. Ярмошына расцаніла як адзін зварот групы "з нагоды выступаў у прэсе, якія абражаюць жанчын". На сайце ЦВК апублікаваны[12] "Адказ на звароты ў Цэнтральную камісію Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, якія носяць масавы характар (больш за дзесяць зваротаў)", згодна з якім у ЦВК "паступілі шматлікія звароты аб нязгодзе з выказваннямі Лукашэнкі А.Г., які вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, якія маюць дыскрымінацыйны характар у

[12] http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2020/otvet1.pdf

дачыненні да беларускіх жанчын" і парушаюць артыкул 47 ВК. На думку ЦВК, артыкул 47 Выбарчага кодэкса, які ўстанаўлівае абмежаванні пры правядзенні передвыбарчай агітацыі, не ўжываецца да асоб, якія вылучаюцца кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, паколькі ў ім прадугледжаныя патрабаванні да агітацыйнай дзейнасці кандыдатаў у Прэзідэнты пасля іх рэгістрацыі. Паняцці заўчаснай агітацыі, на якую паказваюць заяўнікі, на думку ЦВК, выбарчае заканадаўства не ўтрымлівае. Такім чынам, ЦВК не знайшла прававых падстаў для вынясення патрабаванага заяўнікамі папярэджання А. Лукашэнку.

Разам з тым, аналітыкі кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" адзначаюць, што падчас парламенцкіх выбараў 2019 года выбарчыя камісіі рэгулярна выносілі папярэджанні за парушэнне выбарчага заканадаўства ініцыятыўным групам па вылучэнні незалежных і апазіцыйных кандыдатаў за выкарыстанне імі агітацыйных матэрыялаў і выступленні: напрыклад, 27 верасня акруговая камісія Грушаўскай выбарчай акругі № 98 вынесла папярэджанне прэтэндэнту на дэпутацкі мандат актывісту "Еўрапейскай Беларусі" Андрэю Войнічу. Прычынай паслужыў змест ягоных інфармацыйных матэрыялаў, якія ахоплівалі не толькі біяграфічныя дадзеныя прэтэндэнта, але і сацыяльна значныя пытанні (заработная плата ў асобных галінах і інш.). Актывісту БСДП "Народная Грамада" Валянціну Троцкаму, які збіраў подпісы па Старавіленскай выбарчай акрузе №105 у Мінску, камісія вынесла папярэджанне за парушэнне выбарчага заканадаўства: падставай сталі надпісы на стэндзе, якія выкарыстоўваліся на пікетах Троцкага па зборы подпісаў, "Лукашэнка павінен сысці" і "Мая пазіцыя" з некалькімі пунктамі; скарга ў Мінскую гарадскую камісію была безвыніковай. Андрэю Пуканаву, які зарэгістраваў ініцыятыўную групу і збіраў подпісы выбаршчыкаў, выбарчая камісія Гомельскай-Прамысловай выбарчай акругі №35 вынесла папярэджанне: старшыня камісіі ў выступе падкрэсліла, што інфармацыя на стэндзе А.Пуканава ўтрымлівала передвыбарчую агітацыю, якая згодна з заканадаўствам магчыма толькі пасля рэгістрацыі кандыдатаў.

Такім чынам, ЦВК варта выпрацаваць адзіныя правілы для ўсіх кандыдатаў, незалежна ад іх палітычных поглядаў і ўладных паўнамоцтваў з мэтай недапушчэння дыскрымінацыйных падыходаў у ацэнцы вядзення выбарчай кампаніі рознымі суб'ектамі.

Таксама старшыня ЦВК нечакана падтрымала сумнеўную пазіцыю[13] прадстаўнікоў выканаўчай улады і ўслед за імі выказалася аб недапушчальнасці правядзення пікетаў па зборы подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатамі ў фармаце, які склаўся ў некаторых гарадах, калі да пікету ініцыятыўных груп і зборшчыкаў подпісаў выстройваліся вялікія чэргі, а сябры ініцыятыўных груп

[13] https://www.belta.by/society/view/sivak-prizyvaet-ne-putat-sbor-podpisej-i-massovye-meroprijatija-392892-2020/

размяшчалі на месцы збору подпісаў плакаты з лозунгамі грамадска-палітычнага характару, выступалі перад прысутнымі. На думку Л. Ярмошынай, “пікеты па зборы подпісаў прадугледжваюць толькі гэта, а не якія-небудзь публічныя выступы”.

Аналітыкі кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары» адзначаюць, што парадак збору подпісаў сябрамі ініцыятыўных груп у падтрымку вылучэння кандыдатаў усталяваны арт. 61 ВК: “Збор подпісаў выбаршчыкаў можа ажыццяўляцца ў форме пікетавання. Атрыманне дазволу на правядзенне пікетавання для ўказаных мэтаў не патрабуецца, калі яно праводзіцца ў месцах, не забароненых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі”. Паняцці пікетавання выбарчае заканадаўства не ўтрымлівае, такім чынам, яно вызначаецца ў адпаведнасці з Законам “Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь”: пікетаванне – публічнае выказванне грамадзянінам ці групай грамадзян грамадска-палітычных, групавых, асабістых і іншых інтарэсаў або пратэсту (без шэсця), у тым ліку шляхам галадоўкі, па якіх-небудзь праблемах з выкарыстаннем ці без выкарыстання плакатаў, транспарантаў і іншых сродкаў. Да пікетавання прыраўноўваецца сумесная масавая прысутнасць грамадзян у загадзя вызначаным грамадскім месцы (у тым ліку пад адкрытым небам) у вызначаны час для здзяйснення загадзя вызначанага дзеяння, арганізаванае (у тым ліку праз глабальную кампутарную сетку Інтэрнэт або іншыя інфармацыйныя сеткі) для публічнага выказвання сваіх грамадска-палітычных інтарэсаў ці пратэсту. Якіх-небудзь абмежаванняў па колькасці ўдзельнікаў, тэматыцы і форме выказвання меркавання выбарчае заканадаўства не ўтрымлівае. Артыкул 61 ВК і пастанова ЦВК № 14 “Аб тлумачэнні прымянення палажэнняў Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб парадку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь пры правядзенні выбараў у 2020 годзе” усталёўваюць дадатковыя патрабаванні і абмежаванні для пікетаў для збору подпісаў: пры зборы подпісаў выбаршчыкаў сябры ініцыятыўных груп маюць права прадстаўляць грамадзянам для азнаямлення інфармацыйныя матэрыялы з біяграфічнымі дадзенымі асоб, у падтрымку якіх ажыццяўляецца збор подпісаў; названыя інфармацыйныя матэрыялы, а таксама іншыя друкаваныя матэрыялы выбаршчыкам не раздаюцца. Акрамя таго, ва ўмовах пандэміі члены ініцыятыўных груп пры зборы подпісаў павінны прытрымлівацца рэкамендацый Міністэрства аховы здароўя па пытаннях прафілактыкі каранавірусной інфекцыі (ужыванне масак, апрацоўка рук і апрацоўка прадметаў, якія выкарыстоўваюцца, антысептыкам).

Іншыя абмежаванні пры правядзенні мірных пікетаў з’яўляюцца недапушчальнымі як з пункту гледжання нацыянальнага заканадаўства, так і ў адпаведнасці з міжнароднымі абавязацельствамі Беларусі.

Таксама 4 чэрвеня на пасяджэнні ЦВК была разгледжаная скарга Віктара Бабарыкі, які вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты, на парушэнні выбарчага заканадаўства. В. Бабарыка паведаміў ЦВК аб удзеле ў зборы адміністрацый ўстаноў, арганізацый подпісаў за вылучэнне кандыдатам у Прэзідэнты А.Лукашэнкі, уключаючы арганізацыю, інфармаванне, прадастаўленне пашпартных дадзеных работнікаў, а таксама аказання на іх ціску; аб парушэннях асобы, які вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты – А.Лукашэнкам; агітацыю, абразы і паклёп у дачыненні да службовых асобаў Рэспублікі Беларусь, кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, прапаганду сацыяльнай, расавай, нацыянальнай, рэлігійнай ці моўнай перавагі. Трэцяе парушэнне – выкарыстанне пераваг службовага становішча ў інтарэсах абрання пры вылучэнні Лукашэнкі А.Р. ў якасці кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь: прыцягненне асоб, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні ці іншай службовай залежнасці, для ажыццяўлення ў працоўны час дзейнасці, якая спрыяе вылучэнню, а таксама выкарыстанне памяшканняў, займаемых дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі, для ажыццяўлення дзейнасці, якая спрыяе вылучэнню кандыдатам у Прэзідэнты.

У задавальненні скаргі было адмоўлена. У абгрунтаванне сябрамі Цэнтральнай камісіі былі вылучаныя аргументы, якія, ў прыватнасці, прама супярэчаць палажэнням ч.10 арт.61 ВК, згодна з якім удзел адміністрацыі арганізацыі ў зборы подпісаў не дапускаецца нароўні з прымусам у працэсе збору подпісаў і узнагародай выбаршчыкаў за ўнясенне подпісы. Парушэнне гэтых патрабаванняў можа быць падставай для адмовы ў рэгістрацыі альбо адмены рашэння аб рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Варта адзначыць, што Выбарчы кодэкс змяшчае забарону менавіта па радзе суб’ектаў (“адміністрацыя арганізацыі”) і не выключае з-пад забароны збор імі подпісаў па-за межамі працоўнага часу. Гэтая забарона імператыўная і дапаўняе сабой забарону на выкарыстанне кандыдатам пераваг службовага становішча, пад якім, у прыватнасці, разумеецца прыцягненне асоб, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні ці іншай службовай залежнасці, для ажыццяўлення ў працоўны час дзейнасці, якая спрыяе вылучэнню і (або) абранню кандыдата.